*А. А. СУША*

# АДУКАЦЫЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ГРЭКА-КАТАЛІЦКАЙ ЦАРКВЫ Ў БЕЛАРУСІ Ў КАНТЭКСЦЕ ДЫХАТАМІІ “ЎСХОД – ЗАХАД”

*Аналізуюцца працэсы ўзаемадзеяння традыцый усходняга і заходняга хрысціянства, Усходняй і Заходняй Еўропы ў межах адукацыйнай дзейнасці грэка-каталіцкай царквы ў Беларусі, разглядаецца спецыфіка сінтэзу гэтых традыцый.*

Распрацоўка стратэгіі і перспектыў развіцця адукацыі ў Беларусі ў пачатку XXI ст. прадугледжвае вывучэнне і асэнсаванне набытага ў мінулым вопыту вырашэння педагагічных задач. Пры гэтым неабходна ўлічваць геапалітычнае становішча нашай краіны, якая з’яўляецца месцам сустрэчы заходнееўрапейскага культурнага рэгіёна і Расіі, памежжам уплываў заходняга і ўсходняга хрысціянства. У гэтым кантэксце надзвычай важным з’яўляецца вывучэнне адукацыйнай дзейнасці розных канфесій, што існавалі на Беларусі і на працягу вялікага гістарычнага перыяду з’яўляліся фактычна адзінай крыніцай асветы для мясцовага насельніцтва. Сярод іх хацелася б звярнуць увагу на грэка-каталіцкую царкву, якая самім сваім існаваннем абавязана працэсу ўзаемадзеяння ўсходніх і заходніх традыцый у культуры Беларусі.

Даследаванне адукацыйнай дзейнасці гэтай царквы да нашага часу мае несістэмны характар. На працягу XIX – XX стст. выдаваліся работы, прысвечаныя асобным адукацыйным установам (даследаванні А.Надсана, С.Марозавай, А.Самусіка і інш.), вядомым дзеячам на ніве асветы (публікацыі В.Пануцэвіча, У.Конана, С.Падокшына, С.Марозавай, І.Саверчанкі і інш.). Дзейнасць грэка-каталіцкай царквы часткова закранаалася ў працах па гісторыі адукацыі ў Беларусі Ю.Лукашэвіча, Р.Кіпрыяновіча, І.Карнілава, Е.Андрэевай, Н.Гардзіенка і інш. Тым не менш дасюль не праведзена цэласнае даследаванне адукацыйнай дзейнасці грэка-каталіцкай царквы. Зробленая ў пачатку 1920-х гг. А.Савічам спроба такога даследавання не была рэалізавана: цыкл яго публікацый быў перарваны ў сувязі з арыштам і ссылкай аўтара. Многія пытанні дасюль застаюцца зусім не даследаванымі ці даследаванымі недастаткова. Дадзеная работа накіравана на вывучэнне аднаго з такіх пытанняў, а менавіта ўзаемадзеянне ўсходніх і заходніх традыцый у адукацыйнай дзейнасці грэка-каталіцкай царквы.

Адным з важнейшых дасягненняў грэка-каталіцкай царквы было стварэнне ўласнай сістэмы асветы, яна забяспечвала асвету пераважнай большасці беларускага насельніцтва Вялікага княства Літоўскага, якое нярэдка ў той перыяд іншых крыніц для гэтай мэты не мела. Акрамя значнай пашыранасці сеткі шматузроўневых навучальных устаноў у Беларусі, варта адзначыць і вельмі добрую арганізацыю асветніцкай справы грэка-каталіцкай царквы, а таксама высокі ўзровень выхавання і выкладання багаслоўскіх, лінгвістычных, гуманітарных, фізіка-матэматычных, агульнаразвіваючых і іншых дысцыплін.

Спачатку грэка-каталіцкая царква развівала адукацыйныя традыцыі беларускага праваслаўя. Гэта выглядае зразумелым, калі ўлічваць той факт, што грэка-каталіцкая царква па сутнасці рэфармаваная праваслаўная царква [11, с. 294–299]. Аднак гэта не азначае, што адукацыйная сістэма мела выключна ўсходні характар, г.зн. была звязана толькі з руска-візантыйскай традыцыяй. Беларускае праваслаўе мела адметны характар развіцця, яно было адкрытым як для ўсходніх, так і для заходніх традыцый. У прыватнасці, сістэма асветы праваслаўнай царквы ў Беларусі ў XVI – XVII стст. была звязана з інстытутам брацтваў, якіх не было ў Візантыі і Маскоўскай дзяржаве. Гэта сістэма была ўнаследавана грэка-каталіцкай царквой.

У першых адукацыйных захадах грэка-каталіцкай царквы трэба шукаць не нешта самастойнае, але працяг адукацыйнай дзейнасці беларускага праваслаўя, бо першыя школы сталі грэка-каталіцкімі разам з цэрквамі, за якімі яны былі замацаваныя [7, с. 147]. Так, напрыклад, адбылося з брэсцкай школай, якая была заснавана яшчэ да Брэсцкай уніі. Пасля 1596 г. епіскап І.Пацей прыкладаў значныя намаганні для ўмацавання гэтай школы, каб “научати их, ведучи до добрых обычаев и веры старожитной греческой, под послушенством костела повшехного римского” [4, с. 89; 7, с. 148–149]. Кіраваць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

школай быў запрошаны з Рыма грэчаскі святар “веры рускай” доктар філасофіі і багаслоўя Пётр Аркудзій. Як бачна, ужо ў першыя часы у адукацыйнай дзейнасці царквы праявілася жаданне сінтэзаваць усходнія і заходнія традыцыі – усходнія звычаі і падпарадкаванне заходняй царкве, кіраўнік грэк, але прыехаў з Рыма.

На першым этапе адукацыйная дзейнасць грэка-каталіцкай царквы не магла разгарнуцца ў поўную сілу з-за бесперапынных між- і ўнутрыканфесійных спрэчак і непаразуменняў. Таму захоўвалася традыцыя, у адпаведнасці з якой сын святара пераймаў кніжную навуку ад свайго бацькі і потым займаў яго месца. Толькі шчаслівыя маглі атрымаць вартую адукацыю ў спецыяльных школах ці калегіях.

Новая сітуацыя ў канфесійным жыцці краіны патрабавала рэфармавання адукацыйнай дзейнасці грэка-каталіцкай царквы. Новыя ідэі ў Беларусі звычайна распаўсюджваліся мірным шляхам, і вырашальная роля ў гэтым належала асвеце. Так, распаўсюджанне хрысціянства на нашых землях адбывалася пераважна не сілай, а дзякуючы пашырэнню духоўнай літаратуры і ідэй хрысціянскай маральнасці, заснаванню асяродкаў асветы пры храмах і манастырах, а таксама дзякуючы высакароднаму прыкладу служэння першых хрысціянскіх асветнікаў. Бурнае пашырэнне каталіцтва ў XVI ст. у значнай ступені залежала ад рэфармавання каталіцкай сістэмы асветы і актыўнай асветніцкай дзейнасці многіх манаскіх ордэнаў. Немалую ролю ў справе ідэалогіі адыграла руская школа ў XIX ст.

Грэка-каталіцкай царкве стварэнне ўласнай сістэмы асветы давала магчымасць выхаваць адданых сабе, годных і адукаваных людзей, а таксама правесці падрыхтоўку духоўных асоб. Да таго ж заставаліся надзвычай складаныя праблемы, якія ярка паўсталі перад праваслаўнай царквой яшчэ ў XVI ст.: вельмі дрэнны стан асветы пры культавых установах, а таксама невысокі культурны і маральны ўзровень усходняга духавенства [4, с. 87–88; 6, с. 16, 26], дэнацыяналізацыя сацыяльных вярхоў, масавы адыход насельніцтва ад праваслаўнай царквы праз пратэстантызм у каталіцтва, няздольнасць усходняй царквы задаволіць інтэлектуальныя запатрабаванні насельніцтва, што вылівалася ў пошукі асветы за мяжой, дзе беларусы падвяргаліся асіміляцыі. Усё гэта выклікала неабходнасць тэрміновага правядзення рэформаў сістэмы адукацыі.

Іпацій Пацей, адзін з галоўных ініцыятараў Брэсцкага сабора, бачыў выйсце з такой складанай сітуацыі ў наладжванні сувязей з Захадам і каталіцкай царквой, “якая валодае паўнатою асветніцкіх сродкаў…” [7, с. 144]. Пры гэтым спадзявацца толькі на заснаваныя каталіцкай царквой навучальныя ўстановы ніхто не збіраўся. Пацей выступіў супраць распаўсюджанага звычаю аддаваць дзяцей у езуіцкія ўстановы [4, с. 89–90]. Бачылася неабходнасць у стварэнні ўласнай адукацыйнай сістэмы, якая б дазволіла павысіць узровень асветы ў родным краі, дала б магчымасць забеспячэння належнай падрыхтоўкі грэка-каталіцкага духавенства, а таксама стварыць сваю багаслоўскую школу. Грэка-каталіцкая сістэма асветы павінна была быць здольнай у адпаведнасці з характарам самой царквы сінтэзаваць як усходнія, так і заходнія дасягненні на ніве адукацыі, аб’яднаць усходняе багаслоўе, стараславянскую, яўрэйскую і грэчаскую мовы з заходняй тэалогіяй і лацінню. Таму яшчэ пры абмеркаванні ўмоў заключэння царкоўнага саюза яны замацавалі за сваёй царквой магчымасць “засноўваць школы, семінарыі грэчаскай і славянскай моў у тых месцах, дзе будзе вельмі дарэчы” [1, с. 15].

Актыўным рэфармаваннем адукацыйнай дзейнасці царквы заняўся мітрапаліт Я.Руцкі. Тады ўжо было відавочным, што адукацыйная дзейнасць, заснаваная на аснове колішніх праваслаўных школ, не мае перспектыў. Па-першае, школ тых было мала. Па-другое, узровень падрыхтоўкі ў іх быў не вельмі высокім.

Руцкі бачыў перспектывы ўдасканалення царквы ў стварэнні манаскага ордэна, выхаванні духавенства праз рэарганізацыю школьнай справы і ўмацаванне дысцыпліны. Клапаціцца пра асвету тагачасных епіскапаў было ўжо позна, таму неабходна было паклапаціцца пра асвету тых, з асяроддзя каго, па звычаі ўсходняй царквы, выходзяць іерархі, – манаства [2, с. 9]. На першым часе, пакуль адчуваўся недахоп уласных высокаадукаваных педагагічных сіл, меркавалася выкарыстаць досвед каталіцкай царквы – кармелітаў і езуітаў, якія лічыліся найлепшымі настаўнікамі ў Еўропе. Хаця нашмат лепшым для айчыннага юнацтва Я.Руцкі лічыў навучанне не ў езуіцкіх ці якіх іншых каталіцкіх навучальных установах, а ў сваіх уласных, дзе не будзе ні паблажлівага

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

стаўлення да ўсходняга абраду, ні недаверлівых адносін з боку іншых грэка-католікаў пасля сканчэння курса навучання [8, с. 105–106]. Такім чынам, неабходным стала стварэнне больш дасканалай грэка-каталіцкай сістэмы манаства, якая ў сваю чаргу забяспечыла б належны ўзровень адукацыі. У хуткім часе базыльяне сапраўды сталі рухавіком грэка-каталіцкай царквы, а асветніцкі рух у грэка-каталіцкім асяроддзі набыў мэтанакіраванасць і праграмны характар.

Як супярэчлівыя можна ахарактарызаваць узаемадачыненні грэка-каталіцкай царквы з ордэнам езуітаў, які на той час цалкам заслужана лічыўся лідэрам у школьнай справе. Безумоўна, спаборніцтва з ім не магло спадабацца каталіцкаму ордэну. Кіраўнікі грэка-каталіцкай царквы разумелі, што рымска-каталіцкія школы ў ВКЛ з’яўляліся сродкам лацінізацыі і паланізацыі, але недахоп уласных сіл і вопыту штурхаў да супрацоўніцтва з імі, асабліва на першым этапе [4, с. 93–94]. Таму мясцовая моладзь часам накіроўвалася ў вышэйшыя духоўныя навучальныя ўстановы ў Еўропе, сярод якіх галоўная роля належала заснаваным езуітамі ў 60–80-я гг. XVI ст. папскім калегіям або семінарыям (алюмнатам). Грэка-католікаў прымалі калегіі ў Брунсбергу, Пултуску, Вене, Празе, Аламоўцы, Кракаве, Вільні, Мінску, Смаленску і інш. [2, с. 9–10; 4, с. 92; 5, с. 82; 7, с. 176, 184–185; 8, с. 109]. Асаблівае значэнне мела Грэцкая Афанасьеўская калегія ў Рыме, у якой паводле правіл абітурыенты павінны былі даць абяцанне назаўсёды заставацца ва ўсходнім абрадзе.

Спроба сінтэзу ўсходніх і заходніх традыцый прасочваецца ў практыцы грэка-каталіцкіх навучальных устаноў, арыентаванай на вывучэнне ўсходніх і заходніх моў. Вывучэнне грэчаскай, царкоўнаславянскай, лацінскай, польскай і старабеларускай моў, якое практыкавалася ў найбуйнейшых праваслаўных школах [4, с. 89; 7, с. 148], стала вельмі важным і для грэка-каталіцкіх навучальных устаноў, якія імкнуліся аб’яднаць дасягненні на ніве асветы, зробленыя як на Усходзе, так і на Захадзе. Царкоўнаславянская і грэчаская мовы былі неабходныя для чытання класічных тэкстаў і твораў святых айцоў, багаслужэбнай літаратуры. Латынь, акрамя згаданага, з’яўлялася яшчэ і мовай усёй цывілізаванай Еўропы, мовай міжнародных кантактаў, на ёй выходзіла з друку пераважная большасць тагачасных выданняў. Веданне польскай мовы было неабходна для кожнага адукаванага жыхара Рэчы Паспалітай. Што ж да роднай мясцоваму жыхарству старабеларускай (у тагачасных крыніцах – “рускай”) мовы, то няведанне яе было немагчымым.

Ужо пры адкрыцці першых грэка-каталіцкіх школ (у Навагрудку, Мінску і інш.) быў атрыманы дазвол ад караля “в тых школах учыти всих наук... языком кгрецким, латинским, словенским, польским и руским” [4, с. 90; 8, с. 109]. Такая практыка захавалася да канца існавання грэка-каталіцкіх навучальных устаноў і была характэрнай як для свецкіх школ, так і для ўстаноў для святарства. Так, у канцы XVIII ст. протаархімандрыту рэкамендуецца прыкладваць усе свае намаганні на падтрыманне пастаяннага вывучэння ў базыльянскім асяроддзі яўрэйскай, грэчаскай і царкоўнаславянскай моў. Правінцыял павінен быў сачыць за тым, каб у манаскіх школах вывучаліся французская і нямецкая мовы, а тыя, хто вывучае маральнае багаслоўе, каб атрымлівалі веды па царкоўнаславянскай і старабеларускай мовах. Выкладанне ў грэка-каталіцкіх навучальных установах польскай, лацінскай, французскай або нямецкай моў, па жаданні яўрэйскай і абавязкова рускай (расійскай) мовы вялося і ў часы ўваходжання Беларусі ў склад Расійскай імперыі. Нават у Грэчаскай калегіі ў Рыме вялося вывучэнне грэчаскай мовы, а таксама, у адпаведнасці з правіламі калегіі, у час трапезы ў сталовай рэкамендавалася чытаць павучанні на грэчаскай мове (тым, хто вывучае граматыку) і на сваіх родных мовах (усім іншым) [9, с. 171].

Вучэбныя праграмы грэка-каталіцкіх навучальных устаноў уключалі шырокае кола прадметаў, характэрных і для ўсходняй, і для заходняй традыцый: граматыка, спевы, царкоўны лік, “вольныя навукі”, Святое Пісанне, вывучэнне царкоўна-багаслужэбных кніг, прапаведніцтва, літургіка, філасофія [7, с. 177]. Дапаможнікамі пры вывучэнні дыялектыкі (логікі) і філасофіі былі творы Арыстоцеля, Парфірыя, Фемісція, Ф.Аквінскага, Іаана Дамаскіна, Афанасія Вялікага, Яна Златавуснага, Кірылы Іерусалімскага, Максіма і інш., а таксама пастановы царкоўных сабораў [4, с. 92; 9, с. 171]. У працэсе навучання ў грэка-каталіцкіх школах рознага ўзроўню ўвага ўдзялялася багаслоўскай спадчыне ўсходняга і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

заходняга хрысціянства, творам усходніх і заходніх айцоў царквы [4, с. 92]. Такім жа шляхам ішла і праваслаўная царква ў Рэчы Паспалітай у часы рэфармавання сістэмы асветы пры Пятру Магіле.

Для працэсу навучання выкарыстоўваліся як усходнія праваслаўныя, так і заходнееўрапейскія выданні і рукапісы [7, с. 180], а таксама, безумоўна, свае ўласныя кнігі. Як вядома, найбуйнейшыя базыльянскія друкарні ў Вільні, Супраслі, Пачаеве, Мінску забяспечвалі царкву неабходнай літаратурай. З 1628 г. да 1800 г. у іх выдадзена звыш тысячы кніг на старабеларускай, польскай, царкоўнаславянскай і лацінскай мовах [3, с. 26].

Імкненне захаваць самастойны характар царквы, незалежнасць ад Захаду і яго сістэмы асветы вылілася ў спробы стварэння ўласнай вышэйшай навучальнай установы, якія прымаліся кіраўнікамі грэка-каталіцкай царквы з 1623 г. Спачатку высокі ўзровень адукацыі забяспечвалі семінарыі ў Мінску, Вільні, Свержані і інш. У адпаведнасці з пастановамі Замойскага сабора 1720 г. епіскапы павінны былі заснаваць семінарыю ў кожнай епархіі. У 1770–1790-я гг. сярэднія школы працавалі пры манастырах у Беразвечы, Брэсце, Барунах, Вільні, Вярбілаве, Жыровічах, Лядах, Паддубіссі, Талачыне. Навучальныя ўстановы павышанага тыпу з вывучэннем філасофіі, тэалогіі, рыторыкі дзейнічалі ў Антопалі, Быцені, Вільні, Віцебску, Жыровічах, Лыскаве, Любяшове, Нясвіжы, Полацку, Свержані, Таракані. Высокі ўзровень адукацыі забяспечвалі Беларуская семінарыя ў Полацку і Брэсцкая семінарыя ў Лаўрышаве. Важную ролю ў збліжэнні грэка-каталіцкай царквы з праваслаўнай адыграла Літоўская семінарыя ў Жыровічах [4, с. 96–98].

Адзінай вышэйшай навучальнай установай грэка-каталіцкай царквы стала Галоўная семінарыя пры Віленскім універсітэце. Менавіта яна рыхтавала кандыдатаў на вышэйшыя пасады ў царкве. З мэтай процістаяць распаўсюджванню празаходніх ідэй у Галоўнай семінарыі ў 1820-я гг. распрацоўваўся і амаль атрымаў рэалізацыю праект заснавання на аснове Полацкай семінарыі яшчэ адной вышэйшай установы – духоўнай акадэміі. Аднак змена курсу царкоўнай палітыкі і наступствы падаўлення паўстання 1830–1831 гг. не дазволілі рэалізавацца дадзенаму праекту [10, с. 117–121].

Пасля далучэння тэрыторыі Беларусі да Расійскай імперыі адбылося абвастрэнне ўсходніх і заходніх тэндэнцый у рамках адукацыйнай дзейнасці грэка-каталіцкай царквы. З аднаго боку, сама царква зведала паланізацыю і лацінізацыю, у найбольшай ступені зблізілася з заходняй традыцыяй. З іншага боку, афіцыйная пазіцыя ўлады была скіравана на павышэнне ролі ўсходняга кампанента ў культуратворчай дзейнасці грэка-каталіцкай царквы і ўсяго краю наогул. Гэтыя дзве тэндэнцыі процідзейнічалі, што не давала царкве канчаткова схіліцца ні да аднаго боку. Пытанне далейшага лёсу царквы і адпаведна ўсіх яе праектаў было канчаткова вырашана ў 1839 г., калі грэка-каталіцкая царква была далучана да расійскай праваслаўнай царквы.

Такім чынам, у адукацыйнай дзейнасці грэка-каталіцкай царквы адбывалася ўзаемадзеянне і ўсходніх, і заходніх традыцый, выкарыстанне вопыту праваслаўнай царквы і дасягненняў каталіцкай сістэмы асветы. Важнае значэнне ў грэка-каталіцкай школе займала вывучэнне ўсходніх і заходніх моў, багаслоўскіх традыцый абедзвюх галін хрысціянства. Пры гэтым навучанне праходзіла не толькі па ўласных кнігах, але і па тых, што з'явіліся ў праваслаўных і каталіцкіх асяродках культуры. Перавага заходніх ці ўсходніх культурных уплываў назіралася ў залежнасці ад аўдыторыі ўстаноў адукацыі (для свецкіх асоб, для белага святарства ці манаства), ад месцазнаходжання ўстановы (у Беларусі, Польшчы ці далёкім замежжы), ад пазіцыі кіраўніцтва і выкладчыцкага складу навучальнай установы (напрыклад, празаходнія пазіцыі ў Галоўнай семінарыі ў Вільні, у Барунах і арыентальныя погляды ў Жыровічах і Полацку) і г. д.


1. *Артыкулы,* якія належаць да злучэння з Рымскаю Царквою // Царква. – 1996. – № 3-4. – С. 13–16.

2. *Археографический* сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси. – Вильна: Тип. А.Г.Сыркина, 1900. – Т. 12. – 230 с.

3. *Конан, У.* Тэалагічныя і асветніцкія погляды Язэпа Руцкага / У.Конан // Брэсцкай царкоўнай уніі – 400: матэрыялы міжнар. навук. канф., Брэст, 8–9 кастр. 1996 г. – Брэст,


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1997. – С. 23–27.

4. *Марозава, С.В.* Уніяцкая царква ў этнакультурным развіцці Беларусі / С.В.Марозава. – Гродна: ГрДУ, 2001. – 352 с.
5. *Надсон, А.* Беларусы ў Грэцкай Калегіі / А.Надсон // Крыніца. – 1996. – № 4. – С. 81–86.
6. *Падокшын, С.А.* Іпацій Пацей: царк. дзеяч, мысліцель, пісьменнік на пераломе культур.-гіст. эпох / С.А.Падокшын; навук. рэд. А.С.Майхровіч. – Мн.: Бел. навука, 2001. – 118 с.
7. *Савич, А.А.* Западно-русские униатские школы XVII – XVIII веков / А. А. Савич // Працы БДУ. – 1922. – № 2-3. – С. 130–197.
8. *Савич, А.А.* Западно-русские униатские школы XVII – XVIII веков: Ч. 3 / А.А.Савич. – С. 98–123. (Архіў Нац. бібліятэкі Беларусі).
9. *Савич, А.А.* Униатские школы для западно-русского юношества до Брестской церковной унии (1596 г.) / А.А.Савич // Працы БДУ. – 1922. – № 1. – С. 164–175.
10. *Самусік, А.* Праект адкрыцця уніяцкай духоўнай акадэміі ў Полацку / А.Самусік // З гісторыі уніяцтва ў Беларусі / пад рэд. М.В.Біча, П.А.Лойкі. – Мн.: Экаперспектыва, 1996. – С. 117–121.
11. *Суша, А.А.* Аб не-стварэнні грэка-каталіцкай царквы ў 1596 г. / А.А.Суша // Леў Сапега (1557–1633 гг.) і яго час: зб. навук. артыкулаў. – Гродна, 2007. – С. 294–299.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ